# Незабыўныя сустрэчы

**7 красавіка г.г. спаўняецца 80 гадоў з дня нараджэння Кірыпы Трафімавіча Мазурава.**

Упершыню пра гэтага цікавага чалавека я пачуў у 1943 годзе ў партызанскім атрадзе Баранавіцкага злумэння, якое дыслацыравалася ў Налібоцкай пушчы. Памятаю, камісар атрада Станіслаў Ханецкі паведаміў, што на акупіраванай тэрыторыі Беларусі з восені 1942 года знаходзіцца прадстаўнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху, сакратар падпольнага ЦК камсамола рэспублікі К. Т. Мазураў, які выконвае спецыяльнае задание па актывізацыі партызанскага і падпольнага руху ў Мінскай, Палескай, Пінскай і Баранавіцкай абласцях.

Камісар нас папярэдзіў, што, магчыма, Кірыла Трафімавіч наведав і наша злучэнне, і нам трэба быць гатовымі далажыць яму пра баявую і палітычную работу ў тыле праціўніка. На жаль, да нас К. Т. Мазураў не дабраўся. Пасля вайны ўжо я даведаўся, што ў канцы 1943 года ён быў адкліканы ў Маскву.

Упершыню з Кірылам Трафімавічам Мазуравым я сустрэўся пасля вызвалення нашай рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Ён працаваў тады другім, затым першым сакратаром ЦК камсамола Беларусі. Наша сустрэча адбылася летам 1945 года ў будынку ЦК ЛКСМБ, які знаходзіўся на набярэжнай ракі Свіслач (зараз вуліца Янкі Купалы).

Мяне, працуючага некалькі месяцаў пасля вызвалення Мінска ў Рамесным вучылішчы сувязі № 4, Кагановіцкі райкам камсамола рэкамендаваў на вучобу ў Рэспубліканскую школу прапагандыстаў пры ЦК КП Беларусі. Трэба была згода І афіцыйнае накіраванне ЦК камсамола. Размова цягнулася каля гадзіны. Кірыла Трафімавіч цікавіўся, дзе і як ваяваў, ці маю ўзнагароды, якая сям'я. Калі пачуў, што наша партызанскае фарміраванне дыслацыравалася ў Налібоцкай пушчы, прыгадаў, што яму, на жаль, не ўдалося пад час вайны і акупацыі пабываць у Баранавіцкай вобласці. Але з яго ўдзелам быўсфарміраваны Баранавіцкі падпольны абкам камсамола на чале з сакратаром Аляксандрам Рыбаковым, які быў накіраваны ў вобласць у сакавіку 1943 года. Расказаў, як пешшу і на конях з невялікай групай памочнікаў прайшоў і праехаў тады сотні кіламетраў па тэрыторыі Мінскай, Палескай і Пінскай абласцей, разам з падпольнымі абкамамі партыі і камсамола ствараючы новыя партыйныя і камсамольскія арганізацыі, партызанскія атрады, разведвальна-дыверсійныя маладзёжныя трупы, арганізоўваючы "лясныя" агульнаадукацыйныя школы. Кірыла Трафімавіч спытаў у мяне, ці атрымлівалі мы ў Налібоцкай пушчы газету "Чырвоная змена", выпуск якой быў арганізаваны М. В. Зімяніным і Ім у Любанскіх лясах у 1943 годзе. Рэдагаваў яе вопытны журналіст Міхаіл Барашкаў. Я адказаў, што некалькі нумароў "Чырвонкі" ў наш атрад прыслаў Баранавіцкі падпольны абкам камсамола. Усе партызаны з цікавасцю чыталі іх.



З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы